■ Незвычайнае побач

# ЦУДАТВОРНЫ АБРАЗ НА САСНЕ

## У XVII стагоддзі ён вярнуў зрок невідушчаму


Барэцкая ікона Божай Маці ў руках дыякана Сцяфана і айца Сымона — сына і бацькі протаіерэя Тарасія, настаяцеля Любішчыцкага храма.

**Усе мы ведаем, што Жыровіцкі манастыр славіцца цудадзейным абразом Божай Маці «Жыровіцкі». А не так даўно стала вядома, што і ў суседнім, Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці, таксама калісьці быў цудатворны абраз Божай Маці, які з'явіўся тут сляпому на хвоі паблізу вёскі Боркі.**

На месцы з'яўлення іконы ў 1670 годзе была ўзведзена царква, якая за сваю гісторыю некалькі разоў наноў будавалася на тым жа месцы, але да нашых дзён не захавалася. Мясцовая назва месца з'яўлення цудатворнага абраза — Гай. 12 кастрычніка 1973 года царква была спалена, але людзі навакольных вёсак з тых часоў наведваюць тое месца: паставілі крыж, лаўкі, альтанку. У які менавіта час быў страчаны цудатворны абраз, засталося таямніцай. Да нядаўняга часу нават протаіерэй Тарасій Віцько, настаяцель любішчыцкага храма ў гонар Святой праведнай Ганны (Івацэвіцкі раён), які, падтрымліваючы традыцыю, некалькі разоў на год служыў акафісты на прыблізным месцы спаленай царквы, не ведаў, што гэтае месца настолькі праслаўленае.

— Усё пачалося з тэлефоннага званка з экзархата, — распавядае айцец Тарасій, да прыходу якога цяпер адносіцца і в. Боркі. — На тым канцы провада прагучала пытанне: «Чаму вы не аднаўляеце сваю святыню — цудатворны абраз Борацкай Божай Маці?» Я быў, шчыра сказаць, ашаломлены пачутым. Бо нічога пра такую ікону ніколі ў Івацэвіцкім благачынні ніхто не чуў і не здагадваўся. І сталі мы шукаць, перакапалі горы літаратуры царкоўнай, праваслаўныя сайты і, дзякуй Богу, сёе-тое знайшлі.

Айцец Тарасій працягнуў мне адзнятыя старонкі царкоўнага летапісу з кнігі айца Міхаіла (Ермакова), мітрапаліта Кіеўскага, экзарха Украіны, а з 1905-га па 1915-ы — архіепіскапа Гродзенскага і Брэсцкага. У раздзеле «Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы», напісана: «У с. Борках, Слонімскага павета, Быценскага благачыння, у сасновым бары царква драўляная, з такой жа званіцай, у драўлянай агарođжы, збудаваная ў 1778 годзе на месцы ранейшай царквы. У ёй маецца цудатворная ікона Багародзіцы з Прадвечным Богадзіцяткам на левай руцэ Борацкая, — вялікая, напісаная на палатне алейнымі фарбамі, у срэбнай рызе, месцамі пазалочанай.

**«Сапраўды заслона спала з вачэй, калі я выйшаў з царквы...»**

Як паведамляе царкоўны летапіс, царква ўстроена на месцы з'яўлення гэтай святой іконы, і яно тут перадаецца так: «У XVII стагоддзі быў тут густы лес і ручай, праз які ляжала кладка: па кладцы раз прабіраўся сляпы з павадыром і ўпаў. Невядомы голас пры гэтым паклікаў яго: «Паглядзі ўгору!», і калі той падняў твар, ясна ўбачыў на вялікай сасне, што стаяла побач, зіхценне святога абраза Багародзіцы: той, хто быў сляпы, стаў з гэтага часу зусім відушчым». Месца гэтае неўзабаве адзначылі збудаваннем царквы, і яна тут з 1670 г. Царква была першапачаткова прыпісной да суседняй, Любішчыцкай, збудаванай князямі Сапегамі, а з 1698 года стала самастойнай, прыходскай. Дрэва, на якім паказалася св. ікона, у значнай яго частцы стаіць дагэтуль на сваім месцы — яно ў алтары паміж велізарным Багародзічным кіётам і алтарнай задняй сцяною храма: амаль у рост чалавека вышынёю, у ніжняй частцы вельмі тоўстае. Верхавіна ж яго разабраная багамольцамі, якія з даўніх часоў у мностве прыходзяць сюды, поўныя глыбокага спадзявання на дапамогу, асабліва пры вочных хваробах. Паколькі пастаянна збіралася сюды мноства людзей, то князі Сапегі, яшчэ ў 1698 годзе, адлучылі да царквы пад прытулак пры ёй багамольцаў 10 моргаў зямлі, з хваёвымі рослымі дрэвамі па ёй, дзе і цяпер маецца прывольны гаявы прытулак, — не заняты нікім і нічым...»


Акафіст Божай Маці служыў уладыка Сцяфан.

А вось яшчэ адно апісанне цуду ацалення сляпога: «...У 1860 гадах бягучага стагоддзя перад гэтым святым абразом, пасля старанай малітвы, пачаў бачыць селянін бліжэйшай да Боркі вёскі Падстарынь Стэфан Крот: «Сапраўды заслона спала з вачэй, калі я выйшаў з царквы пасля руплівага багамолля прад святой іконай Багародзіцы», — казаў ён усім, як гэта значыцца ў царкоўным летапісе».

Айцец Тарасій паведаміў Высокапраасвяшчэннейшаму архіепіскапу Пінскаму і Лунінецкаму Сцяфану пра гэтую незвычайную гісторыю, а неўзабаве было прынята рашэнне зрабіць спіс цудатворнага абраза. Нядаўна на месцы з'яўлення Борацкай іконы адбылася гістарычная падзея для нашага Івацэвіцкага раёна — спіс цудатворнага абраза Божай Маці быў прывезены сюды ўладыкам Сцяфанам. Прыхаджанам, якія прыехалі з навакольных вёсак і райцэнтра, у прапаведзях архіепіскапа і айца Тарасія было расказана пра гісторыю храма і цудатворнага абраза. Акафіст Божай Маці, велічанні ёй і Мікалаю Цудатворцу спяваліся на фоне прыроды з вялікім натхненнем. Дарэчы, у той дзень ішоў дождж, але прыхаджане то тут, то там выказвалі несумненную ўпэўненасць, што Божая Маці ўсё наладзіць. І ўявіце: падчас набажэнства заззяла сонца! Вось што значыць ад даца волі Божай.

Надзею на тое, што благадаць вернецца, нягледзячы на нашы грахі — страту іконы і храма, выказаў айцец Тарасій. Такая ж надзея гарыць у сэрцах вернікаў — праз 345 гадоў цудатворны абраз нагадаў пра сябе, а значыць, гэта адпавядае волі Божай. Да таго ж, адкрыю вам адзін маленькі сакрэт, у гэты ж дзень невядомымі шляхамі ў нашым раёне апынуўся хлопчык, якому неўзабаве трэба будзе рабіць аперацыю на вочы. Яго прыклалі да абраза і, скажу шчыра, сэрца замірае ў надзеі на цудоўнае ацаленне. Хоць сам факт, што ён апынуўся тут, у полі, у момант прыбыцця іконы, ужо цуд, сэнс якога калісьці, калі будзе патрэбна Госпаду, будзе раскрыты.

Спіс цудатворнага абраза (дарэчы, Казанская ікона Божай Маці таксама спіс, але яна, тым не менш, цудатворная) будзе захоўвацца ў Свята-Ганнінскім храме в. Любішчыцы, а кожную пятніцу ўвечары каля яго будзе служыцца акафіст Божай Маці Борацкай. Тры разы на год — 22 мая, 21 ліпеня і 21 верасня — акафісты будуць служыцца на месцы з'яўлення цудатворнай іконы — у Гаі.

**Валянціна БОБРЫК.**
**Фота аўтара.**
*г. Івацэвічы*

■ Не прапусціце!

# АДНАКЛАСНІК ШАГАЛА ЗАВІТАЎ У ВІЦЕБСК

**Упершыню ў Беларусі прадстаўлена персанальная выстава твораў Восіпа Цадкіна, вядомага на ўвесь свет мастака і скульптара. Цікава, што ён быў аднакласнікам Марка Шагала. Цудам у Віцебску захаваўся будынак, дзе яны вучыліся. Падчас адкрыцця выставы не раз падкрэслівалі, што яе можна лічыць сенсацыйнай культурнай падзеяй сусветнага маштабу. Бо яшчэ не было персанальных выстаў твораў генія.**

— Мы ганарымся тым, што персанальная выстава твораў Цадкіна адкрылася ў яго родным горадзе. Тут можна ўбачыць творы з карпатыўнай калекцыі Белгазпрамбанка, а таксама з прыватных калекцый. А музей на ёй прадставіў паштоўку, якую Цадкін у 1916 годзе даслаў свайму настаўніку Юрыю Пэну, калі ён служыў у французскай арміі, — распавяла **дырэктар Віцебскага мастацкага музея Вольга АКУНЕВІЧ.**

Мастацтвазнаўцы, дарэчы, доўгі час спрачаліся наконт таго, дзе ж нарадзіўся Цадкін. У сваёй кнізе ён узгадваў, што на Смаленшчыне.

— Калі ў 1990-я гады ў Віцебску пачыналі «вяртаць Шагала», было нешта падобнае, як і з Цадкіным. Я пра белыя плямы ў біяграфіі. У прыватнасці незразумелая па дакументах дата нараджэння, «мутнае паходжанне», — разважае **мастацтвазнаўца, краязнаўца, былы дырэктар Музея Шагала Людміла ХМЯЛЬНІЦКАЯ.**

У дарэвалюцыйны час многія яўрэі спрабавалі ўтойваць сапраўдныя звесткі пра сваіх бацькоў, месца нараджэння. Напрыклад: як пісаў Цадкін, яго бацька


Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

быў ахрышчаным яўрэем і прафесарам класічных моў у Смаленскай семінарыі. А ў спісе выкладчыкаў гэтай установы няма адпаведнага запісу. У інтэрнэце можна прачытаць пра тое, што Цадкін нарадзіўся ў Смаленску. Дзіўна, але ў савецкі час у гэтым засумняваўся адзін з самых паважаных смаленскіх краязнаўцаў...


Скульптура Цадкіна.

А вось наконт таго, што Цадкін вучыўся з Шагалам, няма сумненняў. Ёсць дакументы, якія пацвярджаюць, што Восіп у пачатку 1900-х гадоў атрымліваў адукацыю ў Віцебскім гарадскім вучылішчы з Шагалам і будучым мастаком Віктарам Меклерам.

Такі цудоўны падарунак Віцебску — выставу і не толькі яе — зрабілі кіраўнікі Белгазпрамбанка.

— Так, мы гатовы спрыяць і ў далейшай рабоце: больш падрабязнаму вывучэнню біяграфіі мастака... — распавядае карэспандэнту «Звязды» **старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар БАБАРЫКА.** — Заўсёды адкрыты і для ажыццяўлення іншых праектаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

Запоіны. Заручыны. Калі падчас сватаўства бацька і дачка давалі прысутным згоду на вяселле, пачыналіся так званыя «запоіны» («запівіны», «малыя заручыны», «малая гарэлка»). Пасля «запоін» дзяўчына лічылася засватанай. На Беларусі пра яе казалі: «яна запіта» ці «заедзена ячнай».

◈ Але пасля гэтага абраду вяселле яшчэ не было абавязковым. Калі па якой-небудзь прычыне адзін ці другі бок не выконвалі патрабаванняў, даведваліся што-небудзь дрэннае пра жаніха ці нявесту, калі не падабаўся пасаг ці штосьці яшчэ, дамоўленасць магла быць скасавана.

◈ Звычайна праз тыдзень пасля запоін адбываліся заручыны. Асноўная мэта заручын («змовін», «вялікай гарэлкі», «вялікіх запоін», «ладу», «рукабіцця») была ў канчатковай дамоўленасці аб правядзенні вяселля, усіх яго абставінах — як эканамічных, так і абрадавых.

◈ На заручыны, якія адбываліся ў хаце нявесты, запрашалі больш шырокае кола сваякоў, якія былі сведкамі перамоў і дасягнутай дамоўленасці. Удзельнікі гэтага абраду павінны былі больш дэталёва пазнаёміцца з сем'ямі двух родаў; вызначыць асноўных удзельнікаў вяселля (шафер, шаферка і г.д.); вызначыць колькасць гасцей з кожнага боку; колькасць сваякоў, якіх неабходна ўшанаваць падарункамі на вяселлі; тых, хто будзе пячы вясельны каравай; пагадзіцца на склад і колькасць пасагу; тут жа вызначаўся дзень і час вянчання і г.д.

◈ З XVII—XVIII стст. абрад заручын заканчваўся тым, што жаніх і нявеста абменьваліся пярсцёнкамі і тым самым давалі згоду на шлюб. Пасля гэтага бацька нявесты звязваў рукі маладых са словамі: «Дай, Божа, у добры час, на вясёлае жыццё, на дзяцінае шчасце!».

◈ Пасля заручын адмовіцца ад вяселля было практычна немагчыма. І калі адзін з бакоў усё ж такі адмаўляўся ад вяселля, то на гэту сям'ю накладалі штрафныя санкцыі на карысць пацярпелага боку. За выкананнем такіх жорсткіх патрабаванняў назірала мясцовая грамадскасць. З запісаў карэспандэнта: «У Тураве шлюбы заключаюцца па волі бацькоў. На працягу 25 гадоў было толькі 15 выпадкаў адмовы ад шлюбу з боку жаніха ці нявесты, і справа заканчвалася мірна з вяртаннем выдаткаў тым бокам, які адмаўляўся» (г.Тураў, 1898 г).

◈ На Беларусі грамадская думка высока ставіла тую дзяўчыну, да якой часцей ездзілі сваты. Лічылася, што нявеста, якую часта сватаюць, валодае вялікай колькасцю станоўчых якасцяў, з'яўляецца добрай гаспадыняй, майстрыхай, або за ёй будзе ладны пасаг. Але такія надзеі не заўсёды спраўджваліся. А ў народзе казалі: «з вялікага перабору ні лапцяў, ні абораў».